Хаданкоў Андрэй Аляксандравіч,
вучань VI класа ДУА “Сярэдняя школа № 4 г. Горкі”
(настаўнік – Хаданкова Таццяна Мікалаеўна)

# ШТО ТАКОЕ АДЗІНСТВА?

З нядаўняга часу жыхары Рэспублікі Беларусь адзначаюць важнае дзяржаўнае свята – Дзень народнага адзінства. Прыходзіцца яно на 17 верасня, што звязана з гістарычнымі падзеямі нашай шматпакутнай Радзімы. Але што ж хаваецца за гэтым словам – АДЗІНСТВА?..

Для мяне адзінства – гэта калі нейкая група людзей дзейнічае як адно цэлае. Калі ўсе разам імкнуцца да адной мэты, глядзяць у адным напрамку. Калі становяцца побач і крочаць у такт адно аднаму на шляху дасягнення гэтай мэты. Калі ўмеюць дамаўляцца і знаходзіць кампрамісы. Калі не шукаюць, на каго б перакласці адказнасць, за чыёй бы спінай схавацца ў тыя моманты, калі патрэбна рашучасць і гатоўнасць дзейнічаць. Калі не застаюцца ў баку ад вырашэння праблем і цяжкасцей. Калі шукаюць не таго, каго абвінаваціць, а таго, каму трэба дапамагчы, падказаць, накіраваць. Калі кожны выконвае свой кавалак працы, і выконвае яго аддана. Калі гэтыя кавалачкі складаюцца ў адзіны пазл, цэлую прыгожую карціну. Калі перамога – то адна на ўсіх, агульная, адзіная. Але ж і ў выпадку промаху няўдача таксама адна на ўсіх, на кожным ляжыць адказнасць.

Адзінства – гэта як… СЯМ’Я. Толькі вялікая-вялікая. У такой сям’і людзі падтрымліваюць адно аднаго, гатовы ў любую хвіліну прыйсці на дапамогу. Тут шануюць не толькі дасягнутыя вынікі, але і прыкладзеныя табой намаганні. Тут не дапускаюць несправядлівасці. Тут змагаюцца адзін за аднаго. Тут кожны гатовы падзяліцца апошнім. І кожны гатовы абараніць сябра, падставіць плячо.

Мне ўспомнілася байка Льва Талстога “Бацька і сыны”, якую мы вывучалі яшчэ ў пачатковых класах. Там бацька, выхоўваючы сваіх дзяцей, сказаў: “Вось так і вы: калі ў згодзе жыць будзеце, ніхто вас не адолее; а калі будзеце сварыцца ды ўсё паасобку – вас кожны лёгка загубіць”. Значыць, адзінства – гэта ЗГОДА. Гэта калі не паасобку, а РАЗАМ.

І сапраўды: калі звярнуцца да гістарычнага мінулага, можна заўважыць, што адзінства, адзінства народа, часам тварыла сапраўдны цуд. Чаго толькі варта перамога савецкіх салдат над фашысцкай Германіяй! Што зрабіла гэту перамогу магчымай? Канешне, адданасць, смеласць, нават бясстрашнасць нашых прадзедаў. Але ж галоўнае – адзінства. Думкі, мары, надзеі, дзеянні тысяч людзей былі скіраваны ў адным напрамку. І стары, і малы – усе былі аб’яднаны адной мэтай. Значыць, адзінства – гэта ЯДНАННЕ.

А як працуе чалавечы арганізм? Кожная клетачка, кожны орган, кожная сістэма выконвае сваю работу. І ад вынікаў гэтай работы залежыць стан усяго арганізма цалкам. Не функцыянуе нейкая, хоць і маленькая, частка – і

пачынаюцца агульныя праблемы, перабоі, цяжкасці. Значыць, адзінства – гэта ЎЗГОДНЕНАСЦЬ.

З чаго ж яно пачынаецца, адзінства? Напэўна, з сям'і. Калі дзіця бачыць, як бацькі зладжана, разам дзень за днем будуюць будучыню. Затым з'яўляецца школьная сям'я. Тут таксама патрэбна адзінства – адзінства школьнага калектыву, якога патрабуе хуткі рытм школьнага жыцця. І так на кожнай прыступцы сталення чалавек усведамляе сябе часткай нечага большага, чым з'яўляецца ён сам. Значыць, адзінства – гэта вышэйшая ступень самасвядомасці чалавека…

Зусім нядаўна мне давялося разам з бацькамі ўдзельнічаць у школьным сямейным спаборніцтве "Тата, мама, я – спартыўная сям'я". Так атрымалася, што каманда наша называлася "Адзінства". Дэвізам сталі словы: "У адзінстве – наша моц!". Мы сапраўды стараліся дзейнічаць як адзінае цэлае: падтрымлівалі адно аднаго, дамаўляліся, нават прадумвалі стратэгію ўдзелу ў асобных конкурсах. І мы перамаглі! Значыць, адзінства – гэта ЗГУРТАВАНАСЦЬ.

Цяпер ужо я дакладна ведаю: у адзінстве і сапраўды наша моц!..